# Дзейнасць Капыльскага аддзела Нясвіжскага польскага таварыства «Асвята» ў 1907–1910 гг.

**Д. У. Лішай,**
аспірант,
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

*Пачатак XX ст. у Расійскай імперыі адзначаны ўздымам барацьбы нацыянальных супольнасцей за ўплыў у грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным, культурна-асветніцкім жыцці. Гэтаму садзейнічала пэўная лібералізацыя ўрадавай палітыкі ў дачыненні да грамадскіх ініцыятыў. Новыя рэаліі паўплывалі на рост колькасці аб'яднанняў насельніцтва на тэрыторыі беларускіх губерняў, дзе адным з самых актуальных працягвала заставацца «польскае пытанне».*

4 сакавіка 1906 г. у Расійскай імперыі быў выдадзены ўказ «Аб часовых правілах аб таварыствах і саюзах» [1, с. 201–207], які паскорыў легалізацыю дзейнасці грамадскіх арганізацый нацыянальных супольнасцей. У беларускіх губернях актывізаваліся прадстаўнікі польскага руху, якія, у адрозненне ад перыяду паўстання 1863–1864 гг., калі адбывалася адкрытая канфрантацыя з расійскімі ўладамі, выкарысталі новыя нормы дзеючага заканадаўства для рэалізацыі сваіх планаў. Разам з тым мясцовыя адміністрацыі працягвалі строга кантраляваць функцыянаванне польскіх арганізацый, што яскрава адлюстроўвае прыклад існавання Нясвіжскага польскага таварыства «Асвята» ў 1907–1910 гг., якое мела прадстаўніцтвы ў шэрагу буйных гарадоў на тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай і імкнулася актыўна ўдзельнічаць у культурна-асветніцкім жыцці рэгіёна. Але ў даследаваннях А. Смалянчука [2, с. 163, 188; 3, с. 203], А. Сяркова [4, с. 120], В. Быля [5, с. 47–48], В. Матусевіч [6, с. 133, 135], П. Даброўскага [7, s. 133], Д. Тарасюка [8, s. 37–40], прысвечаных польскаму руху на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст., функцыянаванне Нясвіжскага польскага таварыства «Асвята» было апісана даволі сцісла, а існаванне яго асобных аддзелаў узгадвалася эпізадычна. З гэтага вынікае, што праблема дзейнасці Капыльскага аддзела арганізацыі засталася па-за ўвагай гістарыяграфіі, што дазваляе гаварыць пра яе актуальнасць.

Відавочна, што для раскрыцця пазначанай тэмы неабходна звярнуцца да архіўных крыніц. Так, у фондзе 22 «Мінская губернская па земскіх і гарадскіх справах прысутнасць» Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі захоўваюцца асобныя дакументы, прысвечаныя гісторыі Капыльскага аддзела Нясвіжскага польскага таварыства «Асвята» ў 1907–1910 гг. [9]. Гэта заявы, рапарты, праекты статута, журналы пасяджэння Мінскай губернскай па справах аб таварыствах прысутнасці, пратаколы паліцэйскіх аглядаў, спісы членаў арганізацыі, фінансава-ўліковая дакументацыя. Яны дазваляюць даволі падрабязна адлюстраваць стварэнне і дзейнасць аднаго з самых актыўных філіялаў арганізацыі. Таксама варта адзначыць цыркуляр кіраўніка Мінскай губерні з фонду 295 «Канцылярыя мінскага грамадзянскага губернатара», у якім даецца агульная характарыстыка дзейнасці польскіх аб'яднанняў на тэрыторыі рэгіёна ў 1907 г. [10].

Нясвіжскае польскае таварыства «Асвята» пачало актыўную дзейнасць у снежні 1906 г. – студзені 1907 г. У той час арганізацыя знаходзілася на этапе фарміравання сваёй структуры, выпрацоўкі асноўных накірункаў функцыянавання ў культурна-асветніцкай сферы. Праектам статута таварыства прадугледжвалася дакладная мэта: «…поднять уровень умственного и нравственного развития всех слоев польского общества, главным же образом распространением среди него просвещения на родном языке, не упуская из виду полного усвоения ими государственного языка» [9, арк. 8]. Тэрытарыяльная прысутнасць – г. Нясвіж, а таксама Слуцкі, Навагрудскі, Мінскі паветы Мінскай губерні. Планавалася стварэнне школ, курсаў, бібліятэк, чытальняў, ажыццяўленне стыпендыяльнай падтрымкі бедных навучэнцаў, правядзенне дабрачынных акцый, творчых імпрэз [9, арк. 8].

25 красавіка 1907 г. у г. Нясвіжы адбыўся агульны сход членаў «Асвяты», на якім было ўзнята пытанне аб заснаванні асобнага аддзела таварыства. Члены арганізацыі В. Даманская, Н. Загорская, А. Даманская, М. Даманская, К. Аколаў, Ф. Яблонскі, С. Рассудоўскі, Ц. Загорскі, В. Трускаляская, С. Вышамірская заявілі пра неабходнасць стварэння філіяла арганізацыі для актывістаў, якія пражывалі ў м. Капылі і яго ваколіцах. Такая магчымасць прадугледжвалася паводле § 42 статута Нясвіжскага польскага таварыства «Асвята».

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 16.03.2022.

Патрэба ўзнікла ў сувязі са значнай аддаленасцю населеных пунктаў, у якіх пражывалі капыльскія актывісты, ад г. Нясвіжа – арганізацыйнага цэнтра. Гэта не дазваляла членам таварыства рэалізаваць свае правы і выконваць абавязкі ў поўнай меры [9, арк. 67].

У рапарце памочніка слуцкага павятовага спраўніка М. Г. Жыгуліна ад 8 чэрвеня 1907 г. за № 1925 у Мінскую губернскую па справах аб таварыствах прысутнасць даносілася, што ў выніку склаўшыхся ўмоў, засноўваючыся на § 43 статута Нясвіжскага польскага таварыства «Асвята», 19 мая 1907 г. у м. Капыль быў заснаваны Капыльскі аддзел арганізацыі. У першы склад яго праўлення ўвайшлі Я. Трускаляская, Ф. Яблонскі, К. Аколаў, К. Загорскі, В. Даманская, Ю. Загорская. Членамі Назіральнага савета сталі А. Даманская, М. Даманская, К. Прушынскі. Аднак шэраг кіруючых пасад, у тым ліку старшыні Капыльскага аддзела «Асвяты», заставаліся вакантнымі [9, арк. 26].

12 жніўня 1907 г. у м. Капылі адбыўся сход актывістаў Капыльскага аддзела «Асвяты», на якім былі праведзены выбары ў склад Праўлення і Назіральнага савета аддзела. Праўленне ўзначаліла Я. Трускаляская, віцэ-старшынёй стаў Ф. Яблонскі, казначэем – Ц. Загорскі, сакратаром – В. Даманская. У Назіральны савет увайшлі К. Прушынскі, М. Даманская, Л. Даманская. На сходзе былі абмеркаваны пытанні членскіх узносаў, фарміравання кніжнага фонду і стварэння бібліятэкі. Важнай праблемай заставалася папаўненне бюджэту таварыства. Таму члены-землеўласнікі абавязваліся ўносіць па 10 руб. штогод, астатнія члены – па 5 руб. Была пастаўлена задача заснаваць бібліятэку Капыльскага аддзела. Што датычылася адкрыцця навучальнай установы, то прыйшлі да высновы аб мэтазгоднасці такога намеру толькі пасля афіцыйнага дазволу з боку расійскіх улад [9, арк. 68–68 адв., 74 адв.].

Але, як стала вядома з данясенняў расійскіх чыноўнікаў, Капыльскі аддзел «Асвяты» ўдзельнічаў у стварэнні тайных польскіх школ на тэрыторыі Пацейкаўскай, Целядовіцкай, Раманаўскай, Сіняўскай, Цімкавіцкай валасцей Слуцкага павета ў 1907–1908 гг. [9, арк. 75 адв.]. Яны функцыянавалі ў такіх населеных пунктах, як в. Думічы, в. Выня, засц. Язвіны, в. Чарнагубава, в. Навасёлкі Пацейкаўскай воласці, в. Навасёлкі Гавезненскай воласці, засц. Кажушкі. Выяўленыя школы былі зачынены расійскімі ўладамі, а арганізатараў нелегальнага навучання прыцягнулі да судовай адказнасці. У прыватнасці, за ўдзел у адкрыцці польскай тайнай школы ў засц. Кажушкі была пакарана ў судовым парадку член таварыства В. Раманоўская. Асаблівую заклапочанасць у мясцовай адміністрацыі выклікаў той факт, што сярод навучэнцаў гэтых устаноў былі дзеці праваслаўнага веравызнання [9, арк. 76].

У цыркуляры мінскага губернатара Я. Эрдэлі на імя паліцэйскіх і павятовых спраўнікаў ад 28 кастрычніка 1907 г. за № 3161 наконт польскіх таварыстваў «Агніска» і «Асвята» адзначалася наступнае: «…ставят своей главнейшей целью деятельности объединение местного польского населения путем открытия целой сети школ польского типа и воспитания в них юношества в польском духе, причем для достижения своих стремлений в некоторых уездах губернии образованы отделы указанных обществ» [10, арк. 294].

На думку расійскіх улад, кожны член таварыства спрыяў ажыццяўленню плана па распаўсюджванні ў рэгіёне тайных польскіх школ. У якасці падстаў для такога меркавання называлася размеркаванне грашовых сродкаў. Асноўнай крыніцай інфармацыі пра фінансавы бок функцыянавання Капыльскага аддзела Нясвіжскага польскага таварыства «Асвята» з'яўляецца прыходна-расходная кніга. З дакументацыі відаць, што на рахунак Капыльскага аддзела былі пералічаны сродкі ад К. Прушынскага, В. Раманоўскай, Ф. Яблонскага, К. Загорскага, З. Загорскага, Ю. Загорскай, В. Трускаляскай, С. Трускаляскага, Я. Трускаляскай, С. Рассудоўскага, В. Петрашкевіч, ксяндза Ф. Аскеркі. Агульная сума членскіх узносаў з 12 жніўня 1907 г. па 1 студзеня 1909 г. склала 335 руб. Зафіксавана, што 55 руб. было пералічана невядомым мецэнатам [9, арк. 75–75 адв.].

Атрыманыя членскія ўзносы за 1907 г. склалі 145 руб.: 11 членаў унеслі па 10 руб., 4 – па 5 руб., невядомым мецэнатам было перададзена 15 руб. [9, арк. 77–77 адв.]. 10 снежня 1907 г. на сходзе Капыльскага аддзела абмяркоўвалася справаздача казначэя аб расходах за год. Было вырашана накіраваць 145 руб. на шэраг патрэб: 20 руб. – у касу Нясвіжскага польскага таварыства «Асвята», 25 руб. – на набыццё кніг з мэтай папаўнення бібліятэчнага фонду, 20 руб. – на падтрымку навучэнцаў гімназіі г. Слуцка, 80 руб. – на падрыхтоўку настаўніцы дзіцячага садка [9, арк. 69, 74 адв. – 75, 78 адв.].

У сакавіку – лістападзе 1908 г. прыход Капыльскага аддзела «Асвяты» склаў 190 руб.: 14 членаў унеслі па 10 руб., 2 – па 5 руб., невядомым мецэнатам было ахвяравана 40 руб. [9, арк. 78 адв.]. Атрыманая сума была накіравана на патрэбы арганізацыі ў 1908 г.: 30 руб. выдаткавана В. Даманскай на набыццё малітоўнікаў (да 100 асобнікаў), 55 руб. – ксяндзу І. Зноску на падрыхтоўку дзяцей да абраду споведзі, 30 руб. – на бібліятэчныя патрэбы, 20 руб. пераведзена ў касу Нясвіжскага польскага таварыства «Асвята». Грашовы астатак Капыльскага аддзела «Асвяты» на 1 студзеня 1909 г. склаў 55 руб. [9, арк. 70, 75, 79–79 адв.].

10 чэрвеня 1908 г. членамі Капыльскага аддзела была заслухана справаздача, з якой стала вядома аб расходаванні 55 руб. на падрыхтоўку дзяцей да абраду споведзі. У сувязі з пражываннем у в. Шэстакі

і засц. Язвіны пераважнай большасці насельніцтва рымска-каталіцкага веравызнання было вырашана адкрыць для іх спецыяльныя вучылішчы. Прадугледжвалася штогадовае выдзяленне грашовых сум на іх утрыманне ў памеры 150 руб. Асабліва падкрэслівалася неабходнасць выкладання рэлігійных вучэнняў уласнымі кадрамі рымска-каталіцкага касцёла [9, арк. 71, 75].

25 лістапада 1908 г. члены Капыльскага аддзела абмяркоўвалі стварэнне школы сельскагаспадарчага профілю, у якой навучаліся б сталыя дзяўчаты: «…где они приучались бы к порядку, чистоте, благонравию и научились сельскому хозяйству, могли стать со временем умными руководительницами будущих поколений…» [9, арк. 72]. Аднак наступнае абмеркаванне выявіла, што адкрыццё навучальнай установы такога тыпу прывядзе арганізацыю да значных матэрыяльных затрат, што не толькі не дазволіла б заснаваць школу, але і перашкодзіла рэалізацыі іншых планаў у справе пашырэння тайных польскіх школ. Таму абмеркаванне гэтай праблемы было перанесена на іншыя сходы. Аднак ужо на сходзе 25 студзеня 1909 г. было канчаткова зафіксавана, што заснаванне школы сельскагаспадарчага профілю пакуль немагчыма. Таксама Капыльскі аддзел перавёў у касу Нясвіжскага польскага таварыства «Асвяты» 20 руб. Яшчэ 35 руб. былі выдаткаваны на навучанне малазабяспечаных дзяцей. Пасля абмеркавання было вырашана прыпыніць збор членскіх узносаў [9, арк. 72, 75 адв.].

Мінскі губернатар Я. Эрдэлі, падазраючы Нясвіжскае польскае таварыства «Асвята» ў антыўрадавай дзейнасці, даручыў слуцкаму павятоваму спраўніку Э.-Г. Штрыкеру 20 мая 1909 г. тэрмінова правесці рэвізію справаводства ў Капыльскім і Клецкім аддзелах арганізацыі [9, арк. 32]. У рапарце пристава 3-га стана Слуцкага павета С. І. Вабішчэвіча ад 20 мая 1909 г. на імя слуцкага павятовага спраўніка Э.-Г. Штрыкера даносілася, што ім была ажыццёўлена спроба агляду справаводства «Асвяты». Высветлілася, што справаводствам Капыльскага аддзела таварыства загадваў уласнік м. Квецяны К. Загорскі, які сумяшчаў яшчэ пасаду казначэя арганізацыі. Але першапачаткова праверыць дакументы не атрымалася, бо К. Загорскі ў той час знаходзіўся ў г. Нясвіжы, дзе выконваў абавязкі ганаровага міравога суддзі Слуцкага павятовага суда [9, арк. 33–34 адв.]. 23 мая і 27 лістапада 1909 г. прыстаў 3-га стана Слуцкага павета С. І. Вабішчэвіч ажыццявіў рэвізію дакументацыі Капыльскага аддзела «Асвяты». Агляд паказаў, што пры вядзенні справаводства дапускаліся парушэнні. Нягледзячы на тое, што дакументы (кніга пратаколаў пасяджэнняў, прыходна-расходны сшытак) вяліся на рускай мове, сустракаліся запісы па-польску, напрыклад, назва арганізацыі – «Oświata». Многія ўліковыя дакументы не былі афармлены належным чынам, а некаторыя ўвогуле адсутнічалі [9, арк. 41, 74].

Варта падкрэсліць, што справаводства арганізацыі вялося такім чынам, каб было цяжка ўстанавіць агульную карціну дзейнасці таварыства. Ідэйным лідарам тайных польскіх школ лічыўся ўласнік м. Квецяны К. Загорскі. Прыстаў 3-га стана Слуцкага павета С. І. Вабішчэвіч, характарызуючы дзейнасць Капыльскага аддзела таварыства ў сваім пратаколе ад 27 лістапада 1909 г., адзначаў, што яно «…содействовало открытию тайных польских школ, субсидировало их деньгами, насаждало учителей и учительниц исключительно польского происхождения, воспитание в польском духе…» [9, арк. 76–76 адв.]. Вызначаючы галоўную мэту існавання арганізацыі, чыноўнік прыйшоў да высновы, што яе сутнасць заключаецца ў «…пропаганде полонизма и в укреплении польской национальности, и потому следует признать его вредным и подлежащему закрытию» [9, арк. 76–76 адв.].

Перакананы ў антыўрадавай дзейнасці Нясвіжскага польскага таварыства «Асвята» і яго аддзелаў, мінскі губернатар Я. Эрдэлі звярнуўся ў Мінскую губернскую па справах аб таварыствах прысутнасць з прапановай аб закрыцці згаданай вышэй арганізацыі. 17 снежня 1909 г. у Мінскай губернскай па справах аб таварыствах прысутнасці абмеркавалі пытанне далейшага існавання таварыства. Былі выяўлены парушэнні, якія датычыліся Капыльскага аддзела таварыства. Па-першае, нягледзячы на легалізацыю сваёй дзейнасці і асветніцкія мэты, арганізацыя парушала дзеючае заканадаўства (арт. 3715 Зводу статутаў навуковых устаноў і навучальных устаноў ведамства Міністэрства народнай асветы), паводле якога прыватныя навучальныя ўстановы адкрываліся выключна са згоды афіцыйных улад. Па-другое, пры Капыльскім аддзеле функцыянавала бібліятэка, адкрыццё якой прадугледжвала наяўнасць абавязковага дазволу з боку губернскай адміністрацыі. Невыкананне гэтых патрабаванняў прывяло да парушэння арт. 175 Статута аб цэнзуры і друку. Па-трэцяе, Капыльскім аддзелам «Асвяты» былі ўведзены новыя памеры членскіх узносаў, што супярэчыла § 12 статута таварыства [9, арк. 91–95 адв.]. З гэтага вынікае, што расійскія ўлады мелі ўсе падставы для таго, каб пачаць працэс афіцыйнай ліквідацыі ўсёй арганізацыі.

У сувязі з гэтым важна звярнуцца да адказу члена Назіральнага савета Нясвіжскага польскага таварыства «Асвята» В. Бароўскага на прад’яўленыя расійскімі ўладамі абвінавачанні, выдвінутыя 17 снежня 1909 г. на пасяджэнні Мінскай губернскай па справах аб таварыствах прысутнасці. Ён не мог абвергнуць інфармацыю наконт прыналежнасці аддзелаў «Асвяты» да адкрыцця тайных польскіх школ. Што тычыцца бібліятэкі, то намеры ў арганізацыі, сапраўды, існавалі. Так, планавалася выпіска грашовых сум на гэтую патрэбу, аднак план не быў рэалізаваны, бо ўвесь кніжны фонд, па словах В. Бароўскага, быў размеркаваны паміж прадстаўнікамі арганізацыі.

Таксама член Назіральнага савета не змог пракаментаваць сітуацыю з парушэннямі статута арганізацыі Капыльскім аддзелам таварыства, якая датычылася павелічэння членскіх узносаў. Разумеючы ўсю сур'ёзнасць сітуацыі, В. Бароўскі прасіў дазволу на самароспуск арганізацыі [9, арк. 94–94 адв.].

У выніку 17 снежня 1909 г. Мінская губернская па справах аб таварыствах прысутнасць пастанавіла закрыць Нясвіжскае польскае таварыства «Асвята» з усімі яго структурнымі адзінкамі. У студзені 1910 г. адбыўся Ліквідацыйны сход таварыства, па выніках якога арганізацыя спыніла сваё існаванне. Падчас гэтага пасяджэння члены таварыства заслухалі справаздачу аб грашовых сумах у касах філіялаў. Было адзначана, што на рахунку Капыльскага аддзела сродкаў не было [9, арк. 94–96 адв., 99–100]. Пасля закрыцця Нясвіжскага польскага таварыства «Асвята» мінскі губернатар Я. Эрдэлі ўсклаў на слуцкага павятовага спраўніка Э.-Г. Штрыкера абавязкі па наглядзе за тым, каб арганізацыя больш не аднаўляла сваёй дзейнасці [9, арк. 97–98 адв.].

Такім чынам, на фоне лібералізацыі ўрадавай палітыкі Расійскай імперыі ў дачыненні да грамадскіх ініцыятыў у беларускіх губернях актывізаваўся польскі рух. У Мінскай губерні дзейнічала Нясвіжскае польскае таварыства «Асвята», у працы якога ў 1907–1910 гг. адну з галоўных роляў адыгрываў Капыльскі аддзел. Філіял садзейнічаў стварэнню сеткі тайных польскіх школ пры дапамозе асігнавання грашовых сродкаў, падрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў, набыцця кніг. Выступаючы на асветніцкіх пазіцыях, арганізацыя выкарыстоўвала нелегальныя формы дзейнасці. Асаблівую заклапочанасць у расійскіх улад выклікала тое, што ў тайных польскіх школах, мэтавай аўдыторыяй якіх былі дзеці рымска-каталіцкага веравызнання, навучаліся і праваслаўныя сяляне. Таксама таварыствам дапускаліся парушэнні дзеючага заканадаўства пры арганізацыі навучання, вядзенні справаводства, стварэнні бібліятэкі. Прыведзеныя вышэй факты выклікалі негатыўную рэакцыю з боку мясцовай адміністрацыі, што выявілася ў забароне функцыянавання таварыства.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. О временных правилах об Обществах и Союзах, 4 марта 1906 г., № 27479 // Полное собрание законов Российской империи. Собрание 3-е: в 33 т. – СПб., 1906. – Т. 26. – С. 201–207.
2. *Смалянчук, А. Ф.* Палякі Беларусі і Літвы ў рэвалюцыі 1905–1907 гг. / А. Ф. Смалянчук. – Гародня [Гродна]: Ратуша, 2000. – 202 с.
3. *Смалянчук, А. Ф.* Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях, 1864 – люты 1917 г. / А. Смалянчук. – 2-е выд., дапрац. – СПб.: Неўскі прасцяг, 2004. – 404 с.
4. *Сяркоў, А. В.* Палітыка мясцовай адміністрацыі ў дачыненні да польскіх культурна-асветніцкіх таварыстваў у Беларусі ў 1905–1914 гг. / А. В. Сяркоў // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. / Беларус. дзярж. ун-т. – Мінск, 2014. – Вып. 9. – С. 115–128.
5. *Быль, В. А.* «Mała Warszawka»: польскі нацыянальны рух у Нясвіжы / В. А. Быль // Acta Anniversaria: зб. навук. прац Нац. гіст.-культур. музея-запаведніка «Нясвіж» / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Нац. гіст.-культур. музей-запаведнік «Нясвіж». – Нясвіж, 2015. – Т. 1. – С. 45–52.
6. *Матусевич, О.* Польское общество «Освята» в Минске / О. Матусевич // Знакамітыя мінчане: матэрыялы VI Беларус.-пол. навук. канф., Мінск, 9 ліст. 2005 г. / Беларус. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка; рэдкал.: А. Вялікі [і інш.]; навук. рэд. А. Вялікі і З. Вінніцкі. – Мінск: БДПУ, 2005. – С. 133–136.
7. *Dąbrowski, P.* Narodowa demokracja byłego Wielkiego Księstwa Litewskiego: studium z zakresu myśli politycznej i działalności obozu narodowego na ziemiach litewsko-białoruskich w latach 1897–1918 / P. Dąbrowski. – Kraków: Księgarnia Akademicka, 2010. – 388 с.
8. *Tarasiuk, D.* Między nadzieją a niepokojem. Działalność społeczno-kulturalna i polityczna Polaków na wschodniej Białorusi w latach 1905–1918 / D. Tarasiuk. – Lublin: Wydawnictwo Uniwersytetu Marii Curie-Skłodowskiej, 2007. – 211 s.
9. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 22. Воп. 1. Спр. 942. Дело об учреждении и деятельности Несвижского польского общества «Осьвята». 6.11.1906–29.1.1910.
10. НГАБ. – Ф. 295. Воп. 2. Спр. 69. Циркуляры Министерства внутренних дел и Департамента полиции о мерах борьбы с революционным движением и переписка Минского губернатора с уездными исправниками и полицмейстерами по данному вопросу. 1.1.1906–21.1.1909.


**Анатацыя**


У артыкуле даецца агульная характарыстыка дзейнасці Капыльскага аддзела Нясвіжскага польскага таварыства «Асвята» на тэрыторыі Мінскай губерні ў 1907–1910 гг. Адзначаецца актывізацыя прадстаўнікоў польскага руху ў сувязі з частковай лібералізацыяй урадавай палітыкі ў дачыненні да грамадскіх аб'яднанняў. Прыводзяцца факты выкарыстання таварыствам нелегальных формаў працы з мэтай стварэння сеткі тайных польскіх школ у рэгіёне. Робіцца выснова, што апошняе стала галоўнай прычынай закрыцця расійскімі ўладамі як Нясвіжскага польскага таварыства «Асвята», так і яго Капыльскага аддзела.


**Abstract**


The article gives a general description of the activity of the Kapyl department of the Niasvizh Polish Society «Oświata» on the territory of Minsk province in 1907–1910. It notes the revitalization of the role of the members of the Polish movement with a partial liberalization of the government policy on public associations. The facts of illegal forms of activities used by the organization in order to create a network of secret Polish schools in the region are given. It is concluded that the latter was the main reason for the closure of the Niasvizh Polish Society «Oświata» and its Kapyl department by the Russian authorities.